Д. В. Яцевич (глав. ред.) [и др.]. – Минск: Беларусь, 2014. – 814, [12] с.
29. О предоставлении местным властям права прибегать к применению чрезвычайных мероприятий в случаях прекращения или замешательства в сообщениях железнодорожном, почтовом и телеграфном: именной указ Сенату, 29 нояб. 1905 г., № 26984 // ПСЗРИ. Собрание 3: в 33 т. – СПб., 1908. – Т. 25: Отд. 1. – С. 848–849.
30. О выборах в Государственную Думу: Высочайше утвержденное Положение, 6 авг. 1905 г., № 26662 // ПСЗРИ. Собрание 3: в 33 т. – СПб., 1908. – Т. 25: Отд. 1. – С. 645–651.
31. О временных правилах об обществах и союзах: именной указ Сенату, 4 марта 1906 г., № 27479 // ПСЗРИ. Собрание 3: в 33 т. – СПб., 1909. – Т. 26: Отд. 1. – С. 201–207.

**(Дата падачы: 30.01.2019 г.)**

*Я. В. Маслоўскі*
аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

*Y. V. Maslouski*
Graduate student at the department of modern and c contemporary
history of Belarus, faculty of history

**УДК 323.33(476)(091)”1907/1914”**

# УМОВЫ ПРАЦЫ І ВЫТВОРЧЫ ТРАЎМАТЫЗМ НА ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ У БЕЛАРУСІ ў 1907–1914 гг.

# LABOR CONDITIONS AND INDUSTRIAL INJURIES IN BELARUS IN 1907–1914

*На падставе архіўных і статыстычных крыніц праводзіцца аналіз няшчасных выпадкаў, якія адбыліся з фабрычна-заводскімі рабочымі ў Беларусі у пачатку XX ст. Вызначаецца дынаміка зменаў масштабу вытворчага траўматызму ў беларускіх губернях у перыяд з 1907 па 1914 гг. Параўноўваюцца ўмовы працы ў розных галінах вытворчасці прамысловасці ў Беларусі. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі паказваецца розніца ў масштабах вытворчага траўматызма ў галінах вытворчасці беларускіх губерняў.*

*Ключавыя словы: Беларусь; рабочы; прамысловасць; 1907–1914 гг.; пралетарыят; фабрычна-заводскі; беларускія губерні; вытворчы траўматызм; няшчасныя выпадкі; умовы працы.*

*On the basis of archival sources and statistical analyzes of accidents which have occurred with the factory workers in Belarus at the beginning of the twentieth century. It is determined by the dynamics of the scale of occupational injuries changes in Belarusian provinces in the period from 1907 to 1914. Compared working conditions in different sectors of industry production in Belarus. For the first time in the national historiography indicates the difference in the scale of occupational injuries in industries of the Belarusian provinces.*

*Key words: Belarus; Worker; Industry; 1907–1914 gg.; Proletariat; factory; Belarusian province; occupational injuries; accidents; working conditions.*

Для сучаснай гістарычнай навукі актуальнай праблемай для вывучэння з’яўляецца жыццё фабрычна-заводскіх рабочых у Беларусі як адной

з найбольш прагрэсіўных частак тагачаснага беларускага грамадства ў пачатку XX ст. Значную частку жыцця рабочы праводзіў на прадпрыемстве: ад умоў працы, бяспечнасці на вытворчасці залежыў дабрабыт працоўнага. Менавіта таму адным з галоўных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага становішча прамысловага рабочых ў 1907–1914 гг. можна назваць умовы працы і масштаб вытворчага траўматызму.

Мэта працы – вызначэнне і параўнанне масштабу няшчасных выпадкаў фабрычна-заводскіх рабочых беларускіх губерняў і Расійскай імперыі ў 1907–1914 гг.

Для дасягнення асноўнай мэты працы пастаўлены наступныя задачы:

• выявіць частату няшчасных выпадкаў на фабрычна-заводскіх прадпрыемствах;

• паказаць асаблівасці вытворчага траўматызму ў Беларусі.

Вытворчы траўматызм на прамысловых прадпрыемствах беларускіх губерняў не атрымаў належнага асвятлення ў ранейшай беларускай гістарыяграфіі. Між іншым, аднаўленне масштабаў вытворчага траўматызму дасць адказ на пытанне аб якасці і рэалізацыі фабрычнага заканадаўства ў Беларусі ў разгледжаны перыяд. Дазволіць вызначыць тыя галіны вытворчасці, дзе здароўе і жыццё рабочых трапляла ў небяспеку.

Варта прааналізаваць ўмовы працы рабочых беларускіх губерняў. Менавіта яны з'яўляюцца адным з галоўных крытэрыяў для аднаўлення рэальнай карціны сацыяльна-эканамічнага становішча рабочага.

У асобных галінах прамысловасці ўмовы працы адрозніваліся. Найбольш цяжкія ўмовы працы былі ў рабочых гарбарных, запалкавых, шкляных прадпрыемстваў рэгіёну. Так, ў верасні 1907 г. губернская санітарная камісія адзначала, што на гарбарным заводзе Імрота ў Мінску «воздух крайне тяжелый, никаких приспособлений для вентиляции не существует». На гарбарным заводзе Сальмана ў Мінску «асвятленне недастаткова, прыстасаванняў для вентыляцыі ніякіх не ўладкована» [1, с. 283].

Тагачасныя дактары пішуць, што шкодны ўплыў на здароў гарбароў аказвала ўдыханне пылу ў майстэрнях для ачысткі шчаціння. Усе звароты датычыліся хвароб скуры і лёгкіх. Загадчык фабрычна-завадской амбулаторыі г. Мінска доктар С. Л. Саламонаў канстатуе, што амаль усе звароты тычыліся хвароб скуры і лёгкіх: «Сухая скура, пакрытая рознымі высыпкамі, паміж якімі пераважаюць Pithyriasis і Acne; атрафія падскурнага тлушчавага пласта, запаў грудзі і значныя ўчасткі ўшчыльнення лёгачнай тканіны сутнасць звычайных з'яў ў гэтых хворых». Убіраючыся ў скуру і дыхальныя органы, пыл ад шчаціння даваў хваробатворным мікраарганізмам спрыяльную глебу для іх далейшага развіцця [1, с. 283–286]. Аднак на гэтай і на іншых гарбарных прадпрыемствах існавала магчымасць даволі хуткага прафесійнага развіцця. Рабочы-гарбар, навучыўшыся вырабу і ачысткі шчаціння, часта пераходзіў да іншай галіны гэтай вытворчасці: да вы-

рабу шчотак, дзе яму даводзілася мецъ справу з чыстай пазбаўленай пылу шчаціннем і такім чынам рабочы меў магчымасць, калі не зусім акрыяць ад сваіх хвароб, дык, прынамсі, пазбавіцца ад далейшага разбурэння арганізма. Падобнае пацвярджаецца ва ўспамінах Зміцера Жылуновіча [2, с. 154–168].

Адныйі з найгоршых былі ўмовы працы на тытунёвых фабрыках, дзе хварэлі самі працоўныя і члены іх сем'яў. У мінскую фабрычна-завадскую амбулаторыя за 1907 г. яны звярнуліся 975 разоў. Найбольшая колькасць дзіцячых хвароб, па дадзеных С.Л. Саламонава прыпадала на дзяцей тытуннікаў. Рахітызм сярод іх быў звычайнай з'явай [1, с. 287].

Людзей сталага веку на падобных фабрыках у якасці працоўных дактарам не даводзілася сустракаць, што, аднак, можна патлумачыць магчымым пераходам рабочых у іншыя галіны вытворчасці. Рабочыя сярэдніх гадоў пакідалі ўражанне «изнурённых, бледных и преждевременно состарившихся людей». На вачах лекараў «молодые цветущие здоровья девушки быстро меняли свой внешний облик и всё чаще являлись с жалобами на разные недуги». Прычынай шкоднага ўплыву на здароўе рабочых у тытунёвых фабрыках дактары правільна лічылі працяглае ўдыханне тытунёвага пылу, якое пранікала ў дыхальныя шляхі і пастаянным раздражненнем слізістай абалонкі выклікала прыліў і застой крыві ў гэтых органах з усімі наступствамі для арганізма [1, с. 287–288].

Шкодны ўплыў пылу на арганізм працоўных назіраўся таксама ў друкарнях. На дадзеных вытворчасцях дзейнічаў свінцовая пыл, які, всасываясь ў арганізм, ствараў хранічнае атручванне яго, якое выяўлялася ў з'явах раздражнення нервовай сістэмы і засмучэннях з боку кішачніка рабочых друкарняў. Па ступені захворванняў рабочыя друкарняў займалі чацвёртае месца ў Мінску: 1037 выпадкаў за 1907 г. [1, с. 288]. Можна меркаваць, што падобныя сітуацыі былі на прадпрыемствах і іншых беларускіх губерняў.

Адносна небяспечна было працаваць на металургічных прадпрыемствах. Напрыклад, у Мінску найбольшая колькасць зваротаў у фабрычна-завадскую амбулаторыю, 1680 разоў за 1907 г. прыпадала штогод менавіта на металаапрацоўчыую галіну – найбуйшыя з заводаў Мінску вызначынага часу: каля 400 рабочых. Тут рабочыя часта падвяргаліся параненням, ўдарам і апёкам. Амаль усе хірургічныя выпадкі належылі гэтым заводам [1, с. 287].

Акрамя прамысловых устаноў узгаданых галін вытворчасці, на якіх існавала небяспека заразіцца сібірскай язвай, а таксама шэрагу іншых цяжкіх хвароб, астатнія вытворчасці Беларусі не ўяўлялі нічога спецыфічнага для рабочых у сэнсе захворванняў і ў гэтых адносінах апошнія былі схільныя да ўсякіх выпадковых захворванняў нароўні з астатнім працоўным насельніцтвам горада.

На запалкавай фабрыцы Саламонава ў Барысаве ўсе памяшканні былі сырыя з пастаяннымі скразнякамі, а ў машын часта адсутнічалі агароджы

[3, с. 99–101, 104, 758]. Аднак варта адзначыць, што ў паказаным у спасылках зборніку, выдадзеным у 1953 г., падбор матэрыялаў быў выкананы з вядомай тэндэнцыйнасцю. Асноўнай мэтай было не паказаць сапраўднае становішча спраў таго часу, а засяродзіць увагу на адмоўных баках жыцця рабочага дарэвалюцыйнага перыяду. Дастаткова ўспомніць згаданыя вышэй умовы працы на Добрушскай фабрыцы. З яе 8-гадзінным працоўным днём, высокімі заробкамі, навучальнымі ўстановамі для дзяцей рабочых і саміх пралетарыяў, а таксама там ужываюцца найноўшыя сістэмы вентыляцыі і электрыфікацыі, каб зразумець, што становішча працоўных Беларусі было далёка не гэтак адназначным, як гэта імкнуліся паказаць у савецкі час.

У ранейшай гістарыяграфіі існавала меркаванне аб пастаянным росце вытворчага траўматызма. У. П. Панючіч і З. Е. Абезгаўз у частцы калектыўнай манаграфіі «Гісторыя рабочага класа БССР» сцвярджаюць, што ў беларускіх губернях у 1901 г. адбылося 263, а ў 1913 г. 788 няшчасных выпадкаў [4, с. 165–166]. Па іх падліках вытворчы траўматызм павялічыўся за гэты перыяд у 2,5 разы.

Тут трэба адзначыць той факт, што і колькасць рабочых цэнзавай прамысловасці 5 беларускіх губерняў павялічылася амаль у 2 разы з 31 100 чалавек у 1900 г. да 59 760 у 1913 г. [3, с. 29]. Улічваючы гэта, можна паставіць пад сумнеў павелічэнне вытворчага траўматызму ў 2,5 разы. Гэты лік павінен быць меншым, калі звярнуцца да зводаў справаздач фабрычных інспектараў, гэтыя дадзеныя можна пацвердзіць.

Для аднаўлення маштабу няшчасных выпадкаў на вытворчасці варта звярнуцца да колькасці няшчасных выпадкаў: так у 1907 г. адбылося заяўленных 445 няшчасных выпадкаў у 5 беларускіх губернях. Пры разглядзе масштабаў вытворчага траўматызму на ўзроўні беларускіх губерняў атрымоўваюцца наступныя лічбы. Так, у 1907 г. у Віцебскай губерні адбыўся 51 няшчасных выпадак. У суадносінах да агульнай колькасці рабочых губерні гэта выявілася ў 0,8 %. У Віленскай губерні адбылося 80 няшчасных выпадкаў, склаўшы 0,87 %. У Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях адбылося 109 (каля 0,8 %), 135 (1,6 %) і 70 (1,15 %) няшчасных выпадкаў суадносна [5, с. 78–79].

У 1909 г. колькасць няшчасных выпадкаў на фабрычна-заводскіх прадпрыемствах Беларусі павялічылась да 569. На губернскім узроўні у працэнтных суадносінах лічбы амаль не змяніліся. Так, у Віцебскай губерні адбылося 48 няшчасных выпадкаў, што склала 0,85 % ад колькасці рабочых губерні. У Віленскай губерні адбыўся 101 няшчасны выпадак, склаўшы 1,12 %. У Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях адбылося 140 (1,04 %), 166 (1,8 %) і 114 (1,55 %) няшчасных выпадкаў суадносна [6; с. 78–79].

У 1912 г. рабочыя заявілі, што атрымоўвалі траўмы 665 разоў [254, с. 216]. Важна, што гэты год змяніліся прапорцыі траўматызму на

вытворчасці на губернскім узроўні. Амаль не змянілася колькасць няшчасных выпадкаў у Віцебскай губерні, дзе 52 рабочых звярталіся да фабрычнай інспекцыі па поваду няшчасных выпадкаў. Такім чынам, атрымоўваецца, што толькі 0,69 % рабочых атрымалі пашкоджанні. У Віленскай губерні колькасць заяў зменшылася да 96, што адзначае 0,8 % траўміраваных рабочых у гэтай мясцовасці. Значна павялічылася колькасць заяў па поваду пашкоджання на вытворчасці ў Гродзенскай губерні, склаўшы 214 зваротаў. Суадносна 1,29 % траўміраваных ад колькасці рабочых. У Мінскай губерні наадварот колькасць заяў зменшылася да 135 і склала 1,2 % траўміраваных рабочых. Істотна вырасла колькасць траўміраваных у Магілёўскай губерні (да 168), што склала 2,09 % ад колькасці [7, с. 216–218].

У працэнтных суадносінах лічбы паказваюць, што толькі ад 1 % у 1907 г. да 1,2 % у 1912 г. ад агульнай колькасці рабочых заявілі аб пашкоджаннях ці траўмах, атрыманых падчас працы. Пры аналізе гэтых лічбаў неабходна ўлічваць, што каля 25 % заяўленных траўм не адпавядалі рэчаіснасці [5, с. 38]. Падобныя заяўленні складаліся, каб атрымаць належную законам 1903 г., а пазней законам 1912 г. грашовую кампенсацыю за пашкоджанне ці траўму на вытворчасці. Таму толькі 75 % заяваў аб траўмах рабочых можна лічыць даставерными [7, с. 216–217].

У гэта перыяд у цэлым па Расійскай імперыі вытворчы траўматызм знаходзіўся на значна больш высокім узроўні, дасягнуўшы ў 1907 г. 3,5 % заяўленых няшчасных выпадкаў ад агульнай колькасці фабрычна-заводскіх рабочых [5, с. 80–81]. У 1909 г. узровень траўматызму некалькі знізіўся да 3 %. Падобную сітуацыю фабрычная інспекцыя тлумачыла крызісам у прамысловасці, калі узровень вытворчасці падае [6, с. 31]. У 1912 г. узровень заяўленых рабочымі няшчасных выпадкаў, з якіх пры разглядзе пацвярджалася каля 75 %, амаль дасягнуў былых паказчыкаў, склаўшы 4,6 % [7, с. 58]. Згодна з прыведзенымі дадзенымі і аналітакай фабрычных інспектароў, можна сцвярджаць, што эканамічны рост у прамысловасці суправаджаўся павышэннем інтэнсіўнасці працы рабочых. Апошняе з'яўлялася адной з прычын павышэння траўматычнасці ў вытворчасці.

Прычыны адносна невысокага працэнту вытворчага траўматызму ў беларускіх губернях можна знайсці, прааналізаваўшы суадносныя па памерах губерні Расійскай імперыі, якія знаходзіліся побач з беларускімі. Так, у Наўгародскай губерні ў 1907 г. адбылося 155 заяўленых фабрычнай інспекцыяй няшчасных выпадкаў пры колькасці рабочых у 15 933 чалавека [5, с. 78]. У 1909 г. у гэтай губерні адбылося 234 няшчасных выпадкаў пры 15 724 рабочых [6, с. 78]. У 1912 г. колькасць няшчасных здарэнняў вырасла да 473 выпадкаў пры росце працуючых да 20 622 чалавек на канец 1912 г. [7, с. 216]. У працэнтах прыведзеныя лічбы выклядаюць наступным чынам: 1907 г. каля 1% заяўленных выпадкаў, 1909 г. – 1,5 %, 1912 г. 2,3 %

ад колькасці рабочых губерні.

Старэйшы інспектар Мінскай губерні, аналізуючы траўматызм на вытворчасці, прыводзіў наступны вынік: у 1909–1911 гг. ад 62 да 67 % ад агульнай колькасць няшчасных выпадкаў у губерні адбылося пры механічнай апрацоўцы дрэва (як правіла) распілам лесу, 12–16 % пры апрацоўцы металаў і толькі 18–24 % ва ўсіх астатніх галінах вытворчасці [8, арк. 6]. Вялікая ўдзельная вага няшчасных выпадкаў на прадпрыемствах па механічнай апрацоўцы дрэва можна патлумачыць тым, што каля 40 % ад усіх фабрычна-заводскіх рабочых Мінскай губерні працавала менавіта ў гэтай галіне вытворчасці.

Да няшчасных выпадкаў адносілі захворванні сібірскай язвай. Пры цяжкіх пашкоджаннях, што цягнулі за сабою ступень інваліднасці рабочага, амбулаторным лекарам прыходзілася не толькі даглядаць хворага, але пасля заканчэння лячэння забяспечыць пацярпелага дакументам з дакладным пазначэннем ступені абмежавання яго працаздольнасці, выяўленай у працэнтах. У гэтым пытанні было вельмі цяжка задаволіць зацікаўленыя бакі.

Варта адзначыць існаванне нявыяўленых няшчасных выпадкаў, таму высноў па прыведзеных матэрыялах нельга зрабіць свабоднымі ад элемента выпадковасці. Але дадзеныя па Магілёўскай губерні пацвярджаюць вышэй прыведзеныя. Па інфармацыі старэйшага фабрычнага інспектара Магілёўскай губерні, першае месца па колькасці няшчасных выпадкаў займала папяровая вытворчасць, дзе кожны год расла колькасць няшчасных выпадкаў Інспектар адзначае, што «колькасць рабочых расце, расце і колькасць няшчасных выпадкаў, але не ў аднолькавым суаднясенні» [8, арк. 18].

Колькасць рабочых Магілёскай губерні, занятых на 6 прадпрыемствах па выпуску паперы складала ў 1912 г. 2002 чал. пры агульнай колькасць фабрычна-заводскога пралетарыята губерні ў 8036 чал. [42, с. 72, 82]. Па гэтай прычыне нельга лічыць цяжкімі ўмовы працы рабочых папяровых заводаў. Тым больш, што пададзены ўсё таго ж інспектара за 1912 г. на Добрушскай фабрыцы пры 1430 рабочых адбылося толькі 9 няшчасных выпадкаў, а на Шклоўскай папяровай фабрыцы пры 427 рабочых – 21 [8, арк. 18].

Галоўнай прычынай няшчасных выпадкаў на падобнай вытворчасці інспектар лічыў дрэнны тэхнічны нагляд за рабочымі на Шклоўскай фабрыцы. Інспектар дадае, што «на габрэйскіх фабрыках з-за эканоміі, магчыма, заўважаецца неадпаведнае нормам абсталяванне фабрыкі тэхнічнымі сіламі як па колькасці, так і па якасці» [8, арк. 18].

Наступнае месца па колькасці няшчасных выпадкаў у 1909–1912 гг. у Магілёўскай губерні займала льнопрадзільная фабрыка, затым хімічны завод і, пацвярджаючы меркаванне старэйшага фабрычнага інспектара Мінскай губерні, – лесапільныя заводы [9, арк. 18]. У Мінскай губерні на 1912 г. 4389 чалавек працавалі на дрэваапрацоўчых заводах, яшчэ каля 3 тысяч на прадпрыемствах па вырабу фанеры. У Магілёскай губерні на

дрэваапрацоўчых заводах у 1912 г. працавала 1667 чалавек, менавіта таму па колькасці няшчасных выпадкаў падобныя рабочыя займалі першае месца ў Мінскай губерні, і пятае ў Магілёўскай [7, с. 217–218].

Старэйшы фабрычны інспектар Магілёўскай губерні аналізуючы вытворчы траўматызм, канстатаваў: «Што тычыцца ўплыву спосабаў работ на колькасць выпадкаў, а таксама параўнання небяспекі работ на фабрыках старых і новых, то сказаць што-небудзь з гэтай нагоды вельмі цяжка, бо новых спосабаў работ не ўжываецца. Толькі новыя лесапільныя заводы, колькасць няшчасных выпадкаў на якіх знаходзіцца ў прамой залежнасці ад колькасці начной працы» [9, арк. 18–19].

Падобная сітуацыя траўматызму прыведзеных галінаў вытворчасці была характэрна для ўсіх беларускіх губерняў. З гэтага можна вывесці наступны вынік: траўматызм рабочых на вытворчасці залежаў ад загадчыкаў прыдпрыемстваў і іх апеке аб рабочых, а таксама ад асцярожнасці саміх рабочых. З усіх галінаў вытворчасці неслі пагрозу захворванняў для рабочых гарбарныя і тытунёвыя фабрыкі. Траўмы на вытворчасці атрымоўвалі рабочыя металургічных і дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, дастаткова небяспечнымі лічыліся льнопрадзільныя фабрыкі.

За няшчасныя выпадкі на вытворчасці ўладальнікі прадпрыемстваў па законе ад 2 чэрвеня 1903 года (аб узнагародзе рабочых, пацярпелых ад няшчасных выпадкаў) [10, с. 595–606], а затым ад 23 чэрвеня 1912 г. (аб страхаванні рабочых ад няшчасных выпадкаў) [11; с. 868-882] павінны былі выплачваць ім дапамогу. Вышэйзгаданыя законы ўсталёўвалі памер пенсіі пры поўнай, частковай і часовай страты працаздольнасці рабочага і дапамогі сям’і ў выпадку яго гібелі. Разам з гэтым фармулёўкі законаў былі досыць расплывістымі і пакідалі фабрыкантам магчымасці для іх абыходу.

Дынаміка росту вытворчага траўматызму была невялікай. У цэлым супадаючы з дынамікай росту агульнай колькасці фабрычна-заводскіх рабочых. З 1907 па 1913 г. колькасць рабочых, з якімі адбыліся няшчасныя выпадкі на вытворчасці, вагалася паміж 1,1 і 1,2 % у год ад колькасці пралетарыята цэнзавай прамысловасці. У статыстыку амаль не ўвайшлі звароты рабочых на захворванні, атрыманыя падчас працы. Аднак, згодна з прыведзенымі вышэй сведчаннямі дактароў, можна сцвярджаць, што на тытунёвых і гарбарных прадпрыемствах былі найбольш шкодныя ўмовы працы для здароўя рабочых. Менавіта сярод гэтай катэгорыі пралетарыята былі распаўсюджаны цяжкія лёгачныя, скураныя захворванні, а таксама востраінфекцыйныя захворванні, часам сібірская язва, якія былі найбольш небяспечнымі для здароўя.

**Спіс выкарастанных крыніц**

1. *Соломонов, С. Л.* Медицинская помощь фабрично-заводским рабочим г. Минска / С. Л. Соломонов // Труды первого съезда врачей Минской губернии, 22–25 января 1908 г. / под ред. М. А. Поляка. – Минск, 1908. – С. 279–289.

2. *Цішка, Гартны.* Дваццаць гадоў назад (успаміны з мінулага) / Цішка Гартны // Полымя, 1929. – № 5. – Мінск,1929. – С. 162–180.
3. Документы и материалы по истории Белорусии (1900-1917 гг.) / Т.3: (1900–1917 гг.) / под ред. В. Н. Перцева [и др.]. – Минск, 1953. – 1018 с.
4. История рабочего класса Белорусской ССР. В 4-х т. Т. I. Рабочий класс Белоруссии в период капитализма. – Минск,1984. – 400 с.
5. Свод отчетов фабричных инспекторов за 1907 г. – СПб.: Тип. В. Ф. Киршбаума, 1909. – 156 с.
6. Свод отчетов фабричных инспекторов за 1909 г. – СПб.: Тип. В. Ф. Киршбаума, 1910. – 195 с.
7. Свод отчетов фабричных инспекторов за 1912 г. – СПб.: Тип. В. Ф. Киршбаума, 1913. – 318 с.
8. ЦДГАУ у Кіеве. – Фонд 575. – Спр. 610. – Воп. 1. Арк. 1–25. Пояснительная записка старших фабричных инспекторов статистическим данным об увечьях рабочих на фабриках Киевского фабричного округа в 1911 г.
9. ЦДГАУ у Кіеве. – Фонд 575. – Воп. 1. – Спр. 599. – Арк. 18. Пояснительная записка старших фабричных инспекторов статистическим данным об увечьях рабочих на фабриках Киевского фабричного округа в 1912 году. Могилёвская губерния.
10. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). ПСЗРИ. – ПСЗ. Собр. III. – Т. XXIII. – Отд. 1. – № 23060.
11. ПСЗРИ. Собр. III. – Т. XXXII. – СПб., 1915. – № 37444–37447.

**(Дата падачы: 28.02.2019 г.)**

*А. І. Мастыка*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*A. I. Mastyka*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94(476)**

# ФОНД УНІВЕРСІТЭТА СТЭФАНА БАТОРЫЯ Ў ЛІТОЎСКІМ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДЗЯРЖАЎНЫМ АРХІВЕ З ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАГА СКЛАДНІКА Ў ДЗЕЙНАСЦІ ВІЛЕНСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА (1919–1939)

# THE FUND OF STEFAN BATORY UNIVERSITY IN THE LITHUANIAN CENTRAL STATE ARCHIVE FROM THE PERSPECTIVE OF STUDYING THE BELARUSIAN COMPONENT IN VILNIUS UNIVERSITY (1919–1939)

*У артыкуле разглядаюцца матэрыялы архіва Універсітэта Стэфана Баторыя з мэтай выяўлення архіўных спраў, датычных беларускай праблематыкі. Архіўныя матэрыялы, якія прадстаўлены ў артыкуле, адлюстроўваюць: дзейнасць універсітэта з перспектывы рэалізацыі адміністрацыяй Універсітэце Стэфана Баторыя сваёй нацыянальнай і культурнай палітыкі ў дачыненні да груп студэнтаў нацменшасцяў; дзейнасць і гісторыю існавання беларускіх студэнцкіх арганізацый пры Універсітэце Стэфана Ба-*